Журавлёва Дарья Валентиновна

Скарб адзінства

Пад крылом буслiным, дзе бушуе жыта,
Дзе туман начны хінецца да травы,
Светлай праўдаю гісторыя прашыта,
Каб у шчасці жыў народ наш векавы.

Нас калісьці межы рэзалі на часткі,
Брат глядзеў на брата праз нямы кардон.
Але прага волі, прага міру, шчасця
Знішчыла нарэшце той ліхі прыгон.

Абняліся рэкі, уздыхнулі гоні,
Засвяціўся зоркай новы, светлы век.
Беларусь трымае мір у сваёй далоні,
Каб шчаслівым быў тут кожны чалавек.

Захаваем разам гэты скарб бясцэнны,
Што па кроплі бралі з праведных вякоў.
Хай над кожнай хатай свеціць сонца ясна,
І пануюць мір, адзінства і любоў.